## Памяці таварыша

# МІХАІЛ ІВАНАВІЧ ЖЫРКЕВІЧ



Памёр вядомы вучоны і педагог, заслужаны дзеяч навукі БССР, удзельнік грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў Міхаіл Іванавіч Жыркевіч. Беларускае мовазнаўства страціла аднаго з сваіх старэйшых і паважаных даследчыкаў, выхавацеля многіх беларускіх лінгвістаў і настаўнікаў-філолагаў, стваральніка падручніка беларускай мовы, па якому вучылася не адно пакаленне школьнікаў рэспублікі.

М. І. Жыркевіч нарадзіўся 13 кастрычніка 1899 года ў вёсцы Залесавічы Крычаўскага раёна Магілёўскай вобласці ў сялянскай сям'і. У час грамадзянскай вайны і замежнай інтэрвенцыі змагаўся супраць белапалякаў. Пасля дэмабілізацыі з радоў Чырвонай Арміі ў 1921 годзе пачаў працаваць настаўнікам у вясковых школах на Крычаўшчыне, вучыўся на курсах павышэння кваліфікацыі настаўнікаў у Гомелі. У 1923 годзе ён паступае на этнолага-лінгвістычнае аддзяленне педагагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта, якое скончыў у 1927 годзе і стаў выкладаць беларускую мову і літаратуру ў сярэдняй школе, а затым у Магілёўскім педагагічным тэхнікуме. З 1933 года М. І. Жыркевіч становіцца выкладчыкам беларускай мовы і методыкі яе навучання ў Магілёўскім педагагічным інстытуце.

З першых дзён Вялікай Айчыннай вайны М. І. Жыркевіч — непасрэдны ўдзельнік баёў з нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Аднак пасля кантузіі ён звальняецца з арміі і ў пачатку 1942 года прызначаецца дырэктарам сярэдняй школы ў Краснаярскім краі. Як толькі ў канцы 1943 года пад Масквой на станцыі Сходня аднавілася дзейнасць Беларускага дзяржаўнага універсітэта, М. І. Жыркевіч як ужо вядомы спецыяліст у галіне беларускай філалогіі быў адкліканы на працу ва універсітэт. З гэтага часу ўся працоўная біяграфія М. І. Жыркевіча звязана з Беларускім дзяржаўным універсітэтам імя У. І. Леніна. Ва універсітэце ён у 1944 годзе абараніў дысертацыю «Да методыкі пабудовы падручніка па беларускай мове» і атрымаў вучоную ступень кандыдата педагагічных навук, а ў 1945 годзе — вучонае званне дацэнта, распрацаваў універсітэцкія курсы сучаснай беларускай мовы і методыкі яе выкладання, якія з поспехам чытаў на працягу многіх гадоў, тут ён вырас у вопытнага педагога-метадыста, высокакваліфікаванага даследчыка і кіраўніка навукі, сваёй самаадданай працай заслужыў вялікую павагу сярод студэнтаў і выкладчыкаў. Шмат зроблена ім для станаўлення філалагічнага факультэта і ўмацавання яго кадрамі, для павышэння якасці падрыхтоўкі студэнтаў-філолагаў. У цяжкія пасляваенныя гады ён працаваў дэканам філалагічнага факультэта, узначаліў вылучаную ў 1956 годзе з агульнай кафедры беларускай мовы і літаратуры кафедру беларускай мовы, якой кіраваў больш за 10 гадоў. За час працы ва універсітэце М. І. Жыркевіч стварыў шэраг каштоўных даследаванняў. Асабліва плённа вывучаў ён моўнае майстэрства.

Выключна вялікія заслугі М. І. Жыркевіча ў стварэнні стабільнага падручніка па беларускай мове для сярэдняй школы, над якім ён нястомна працаваў з 1936 года. Першае выданне падручніка, падрыхтаванае ў сааўтарстве з Ю. А. Шакалем, выйшла ў 1937 годзе. Пасля Вялікай Айчыннай вайны падручнік быў карэнным чынам перапрацаваны сумесна з А. С. Карзонам, а ў 1955 годзе М. І. Жыркевіч стварыў новы падручнік, які вытрымаў больш 15 перавыданняў.

М. І. Жыркевіч актыўна ўдзельнічаў у грамадскім жыцці, уваходзіў у склад розных грамадскіх і навукова-метадычных арганізацый, выбіраўся дэпутатам Мінскага гарадскога савета народных дэпутатаў.

Навукова-педагагічная і грамадская дзейнасць М. І. Жыркевіча адзначана двума ордэнамі «Знак Пашаны», шасцю медалямі, двума Ганаровымі Граматамі Вярхоўнага Савета БССР, нагрудным знакам «Выдатнік асветы БССР». У 1951 годзе яму было прысвоена званне заслужанага дзеяча навукі БССР.

Заслугі М. І. Жыркевіча ў развіцці беларускай нацыянальнай культуры і асветы, яго ўклад у беларускае мовазнаўства ніколі не будуць забыты. Тыя, хто ў яго вучыўся, хто працаваў побач з ім і ведаў яго асабіста, назаўсёды захаваюць у сваёй памяці яго светлы вобраз — чалавека шчодрай душы, чулага сэрца, нястомнага, самаадданага працаўніка.

**Л. М. Шакун**